

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА-МЕЛОДЫЯ СЭРЦА



Мова...
Родная мова...
У марах, у песнях, у снах.
Мае ў ёй кожнае слова
Свой колер, і смак, і пах.
Зліваюцца гукі ў словы
І ў рэчышча роднай мовы,
Як рэкі ў мора, цякуць,
І думкі мае плывуць
На хвалях і дзён, і начэй
Да сэрцаў людскіх і вачэй.

А.Грачанікаў



*Мова… Наша родная мова… Колькі мілагучнасці, таемнасці ў гэтым слове. Залатыя лісцікі на дрэвах, кожная птушка, кожная кветка і, канешне, чалавек — усе маюць сваю мову. «Самы найвялікшы і бясспрэчны закон жыцця — гэта людская мова, праз якую чалавек стаў вышэй за ўсіх істот пад сонцам», — пісаў знакаміты Янка Купала. Сапраўды, чалавечую мову нельга параўнаць з мовай птушак, жывёл, раслін. Яна з'яўляецца больш прыгожай, мілагучнай, дзякуючы ей людзі размаўляюць, вучацца, дасягаюць сваей мэты.*




**Каласы роднай мовы** / уклад. У. В. Анічэнка, К. С. Усовіч . - Мінск: Універсітэцкае, 1990. - 278 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**

**Кніга хрэстаматыйнага тыпу ўключае вершаваныя творы (урыўкі) пра беларускую мову. Складаецца з трох разделаў. У першым раздзеле змешчаны тэксты беларускіх паэтаў, у другім - паэтаў беларускага замежжа, у трэцім - паэтаў з рэспублік нашай краіны і суседняй Польшчы. Для зручнасці карыстання кнігай пададзены тэматычны і іменны ўказальнікі.**

**Для студэнтаў - будучых настаўнікаў; выкладчыкаў, настаўнікаў сярэдніх школ, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца беларускай мовай, гісторыяй яе развіцця.**




**Юрэвіч, У.**

**Слова жывое, роднае, гаваркое**...: дапаможнік для настаунікаў / У. Юрэвіч. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1998. - 282 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**

Кніга «Слова жывое, роднае, гаваркое...» пра тое, што кожнае слова азначае, пра яго паходжанне (этымалогію) і разам з тым раскрыццё сэнсу яго. Калі вы цікавіцеся гісторыяй гзтага слова, што зусім блізка каля вас, разам з вамі (імя, прозвішча, назва той мясціны, дзе вы нарадзіліся, дзе жывеце, гісторыя адзення вашага), вы абавязкова яе прачытаеце. У 1994 годзе кнізе была прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспубпікі Беларусь.

**Воўк-Левановіч, О. В.**

***Лекцыі па гісторыі беларускай мовы*** / О. В. Воўк-Левановіч. – Мінск: Народная асвета, 1994. – 205 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 9аб;3чз**




**Доступ да гэтай кнігі доўгі час быў вельмі абмежаваны — выдатны беларускі мовазнаўца 0. В. Воўк-Леванорiч у 30-я гады быў рэпрэсіраваны, а лічаныя экземпляры яго кнігі з'яўляюцца сёння бібліяграфічнай рэдкасцю. Дадзенае — другое — выданне перадрукавана з мікрафільма, які захоўваецца ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.**

**Сучасная беларуская мова:** вучэбны дапаможнік для студэнтаў спец. "Пачатковая адукацыя" устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / *Л.* М. Грыгор'ева, Г. Ф. Андарала, С. К. Берднік і інш.; пад агульнай рэд. *Л.* М. Грыгор'евай. - 4-е выд., выпр. - Мінск: Вышэйшая школа, 2011. – 622 с.
**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 2чз**






*Падрыхтаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай для студэнтаў ВНУ спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя". Дае тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, якія з'яўляюцца неабходнай базай для будучай прафесійнай дзейнасці. Фарміруе ўяўленне пра беларускую мову як развітую функцыянальную сістэму, што ўваходзіць у агульную сістэму моў свету як унікальная сацыякультурная з'ява.*




**Багамолава, А. М.**

**Стылістыка і культура беларускага маўлення**: вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ і па філалагічных спец. / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мінск: Издательство Гревцова, 2012. – 303 с.

***Колькасць экзэмпляраў : усяго – 2чз***

**У вучэбным дапаможніку даецца падрабязная характарыстыка функцыянальных стыляў (у тым ліку канфесійнага) сучаснай беларускай мовы: апісваюцца падстылі, жанры, лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці; разглядаюцца камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце, выразнасць, вобразнасць, сцісласць) і сродкі іх рэалізацыі. У практычнай частцы прапануюцца разнастайныя па змесце і мэце практыкаванні, накіраваныя на авалоданне і замацаванне тэарэтычнага матэрыялу курса, на ўдасканаленне ўменняў выкарыстоўваць атрыманыя веды пры аналізе моўных з'яў і фактаў. Дапаможнік змяшчае тэксты розных стыляў для аналізу, прыклады парадак лінгвастылістычнага аналізу тэкстаў, узоры тэстаў, спіс літаратуры.**

**Адрасуецца выкладчыкам, студэнтам, магістрантам і аспірантам дзённай і завочнай формаў навучання ВНУ. Можа быць выкарыстаны настаўнікамі агульнаадукацыйных і спецыяльных школ, гімназій, ліцэяў, усімі, хто цікавіцца стылістыкай і культурай беларускага маўлення.**

**Завальнюк, У. М.**

**Слоўнік сучаснай беларускай мовы / У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч; пад рэд.: М. Р. Прыгодзіча, У. М. Завальнюка. – Мінск: Народная асвета, 2009. – 399 с.**

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 2чз**

*Слоўнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Правшах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». У выданні прадстаўлена лексіка сучаснай беларускай літаратурнай мовы, у тым ліку прафесійная, філасофска-рэлігійная і тэрміналагічная. Дадзены звесткі аб вымаўленні, націску і ўтварэнні граматычных форм слоў. У якасці дадаткаў прапануюцца ўласныя імёны з Новага Запавету, словы і звароты ветлівасці.*





У кнігу ўключаны творы старажытнай пісьменнасці, творы вялікіх гуманістаў-асветнікаў Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага і інш. Гэта – палемічная і сатырычная літаратура, у якой ярка выявіліся настроі і мары беларускага народа ў розныя гістарычныя часы.




**Старажытная беларуская літаратура**: зборнік / уклад. Л. С. Курбека ; аўт. прадм. У. Г. Кароткі. – Мінск: Юнацтва, 1990. – 350 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**




**Беларускі казачны эпас** / склад. В. Анічэнка. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1976. – 207 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**

Зборнік "Беларускі казачны эпас" складаюць разнастайныя па змесце і форме вусна-паэтычныя і празаічныя творы, створаныя і запісаныя ў розны час на тэрыторыі Беларусі. Фальклорны зборнік друкуецца ўпершыню па рукапісы, выяўленай у 1973 г. у бібліятэцы Польскай Акадэміі навук у Кракаве, у якой утрымліваецца больш за 60 казак на беларускай мове з вёсак былых Мазырскага, Рэчыцкага і Навагрудскага паветаў. Казкі былі запісаныя беларускім лацінскім шрыфтам у канцы XIX ст. і створанага ў 1898 г. трапілі ў Кракаў з Вільні. Мае вялікае пазнавальнае значэнне для гісторыкаў, літаратараў, мовазнаўцаў.



**Беларуская літаратурная спадчына**: анталогія ў 2-х кн. Кн. 1 / уклад. С. А. Курбанава [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 1029 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**






**У першай кнізе анталогіі прадстаўлены тэксты найбольш каштоўных фальклорных і літаратурных помнікаў: ад твораў вуснай народнай творчасці і сярэднявечнай літаратуры да літаратуры ХХ ст. Літаратурныя тэксты суправаджаюцца сціслымі звесткамі пра аўтараў, каментарыямі да твораў, ілюстрацыямі. Анталогія складзена на падставе вучэбнай праграмы па беларускай літаратуры для агульнаадукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь.**

**Разлічана на выкладчыкаў літаратуры, вучняў, абітурыентаў і студэнтаў, а таксама ўсіх, хто цікавіцца беларускай літаратурай і культурай.**




**Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў** / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; уклад.: В. І. Скідан, А. М. Хрушчова ; навук. рэд. А. С. Ліс. - 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 330 с.
**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**

У том уключаны багатыя скарбы беларускага фальклору, сабраныя ў першай палове XIX ст. Янам Чачотам і Яўстафіем і Канстанцінам Тышкевічам. Сярод сабраных матэрыялаў ёсць самыя розныя песні: абрадавыя і неабрадавыя, вясельныя, жніўныя, калядныя, купальскія, жартоўныя, баладныя, прыпеўкі. Значнае месца ў томе адведзена прыказкам і прымаўкам, апісанням абрадаў, нататкам і заўвагам збіральнікаў фальклору.

Упершыню выданне выйшла ў 1997 г.

Разлічаны на фалькларыстаў, этнографаў, філолагаў, гісторыкаў, усіх, зто цікавіцца беларускай народнай творчасцю.



**Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы** / склад. Ф. Янкоускі. – 3-е выд., дапрац., дап. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.
**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**






Рупліва адабраныя, прафесійна апрацаваныя беларускія прыказкі і прымаўкі даюць цэласнае ўяўленне пра глыбіню і значнасць мовы беларускага народа. Разлічана на шырокае кола чытачоў.




**Літаратура Беларусі 19 стагоддзя**: анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоускі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск: Беларуская навука, 2013. - 861 с.

**Колькасць экзэмпляраў : усяго – 1аб**

Анталогія з'яўляецца адным з самых поўных выданняў, прысвечаных перыяду станаўлення новай беларускай літаратуры, які прыпадае на XIX ст. У яе ўключаны лепшыя ўзоры мастацкага слова пісьменнікаў, жыццёвы шлях якіх непасрэдна звязаны з Беларуссю, а творчасць вывучаецца ў межах адпаведных праграм для агульнаадукацыйных школ і ВНУ. Падаюцца ў перакладзе на беларускую мову творы ўраджэнцаў Беларусі, напісаныя на іншых мовах, але без якіх немагчыма ўявіць тагачасны літаратурны працэс і якія непасрэдна ўздзейнічалі на развіццё айчыннай літаратуры пачатку XX ст.

Адрасуецца шырокай аўдыторыі, неабыякавай да роднай культуры. Можа быць выкарыстана студэнтамі і выкладчыкамі ВНУ.



*Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш сваю мову, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займае, пасля зусім замерлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі.*

*(Ф. Багушэвіч)*



# Спасибо за внимание!



Выставку подготовила
библиотекарь 2 кат.
Езовитова О. П.